ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама

А.Л.Вярсоцкі
2018 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу сюжэтна-гульнёвых праграм "Сто затей для всех друзей"

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу сюжэтна-гульнёвых праграм "Сто затей для всех друзей" (далей – Агляд-конкурс сюжэтна-гульнёвых праграм).

2. Мэтамі і задачамі Агляду-конкурсу сюжэтна-гульнёвых праграм з'яўляюцца: папулярызацыя і актывізацыя гульнёвага жанру ў вобласці, павышэнне прафесійнага ўзроўню і выканальніцкага майстэрства культарганізатараў, вядучых сюжэтна-забаўляльных праграм; адраджэнне і развіццё традыцыйных народных гульняў, стварэнне новых гульнёва-забаўляльных праграм і далейшае выкарыстоўванне іх у сучасных мерапрыемствах; прапаганда беларускай народнай гульні; садзейнічанне выяўленню, вывучэнню і распаўсюджванню разнастайных форм гульнёвага жанру, далучэнню насельніцтва да розных форм дасугавай дзейнасці, абагульненню існуючага вопыту, яго папулярызацыі і ўкараненню ў практыку клубнай работы.

3. Арганізатарамі Агляду-конкурсу сюжэтна-гульнёвых праграм з'яўляюцца: галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці".

4. Агляд-конкурс праводзіцца 1 раз у 2 гады адпаведна графіку.

5. Агляд-конкурс праводзіцца ў 2 этапы: 1 этап – раённыя адборачныя агляды, 2 этап – абласны адборачны агляд і ўзнагароджванне ўдзельнікаў.

6. У рамках 1 этапа кожны раён вылучае лепшых для ўдзелу ў 2 этапе.

7. 2 этап – абласны тур, у якім аддзелы ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі гаррайвыканкамаў прадстаўляюць 4-5 лепшых сюжэтна-забаўляльных праграм тэматычнага, сюжэтна-гульнёвага, сучаснага, гумарыстычнага характару для розных узроставых катэгорый насельніцтва.

8. Працягласць кожнай сюжэтна-гульнёвай праграмы не больш за 20 хвілін.

9. Па выніках конкурсу журы вызначае і ўзнагароджвае дыпломамі лаўрэата ( I, II,III ступені) і прызамі пераможцаў па наступнай намінацыі:

лепшая пазнавальна-гульнёвая праграма.

10.Журы узнагароджвае канкурсантаў спецыяльнымі дыпломамі і прызамі:

за лепшую аўтарскую праграму,

за артыстычнасць,

за прапаганду беларускай народнай гульні,

за лепшую тэатралізацыю праграмы,

за лепшае мастацкае афармленне,эстэтыку рэквізіта,(касцюма),

за прадстаўленне праграмы, пабудаванай на матэрыяле свайго рэгіёну,

за лепшую дзіцячую праграму,

за лепшую фальклорную праграму.

11. Журы мае права аб'ядноўваць, падзяляць лаўрэацкія месцы, вызначаць дадатковыя намінацыі, а таксама ўзнагароджваць канкурсантаў дадатковымі дыпломамі і прызамі (у рамках выдзеленага прызавога фонду).

12. Пры падвядзенні вынікаў Агляду-конкурсу журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі:

-сцэнічная культура і ўзровень выканальніцкага майстэрства;
-выкарыстанне сучаснага і традыцыйнага мясцовага матэрыялу;
-мастацкі ўзровень рэпертуару і яго якасць;
-артыстызм, арыгінальнасць выканання.

13. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

14. Фінансаванне выдаткаў на правядзенне агляду-конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК «Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці».

15. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: прызы, дыпломы, рамкі.

16. Для фінансавання Агляду-конкурсу на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

17. Арганізатары Агляду-конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу сюжэтна-гульнёвых праграм "Сто затей для всех друзей"

# ГРАФІК

*правядзення абласнога агляду-конкурсу сюжэтна-гульнёвых праграм "Сто затей для всех друзей"*

***Сакавік***

1. Зэльвенскі раён;
2. Воранаўскі раён;
3. Навагрудскі раён;

***Красавік***

4. Ваўкавыскі раён;
5. Слонімскі раён;

***Май***

6. Іўеўскі раён;
7. Смаргонскі раён;
8. Ашмянскі раён;

***Чэрвень***

9. Карэліцкі раён;
10. Дзятлаўскі раён;
11. Свіслацкі раён;

***Жнівень***

12. Бераставіцкі раён;
13. Мастоўскі раён;
14. Шчучынскі раён;
15. Гродзенскі раён;

***Верасень***

16. Лідскі раён;
17. Астравецкі раён;
18. г.Гродна.